Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 50 (119) ПЯТНІЦА 1 САКАВІКА 1940 г.

Цана 10 капеек

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 28 лютага на Карэльскім перашыйку наступленне нашых часцей прадаўжала развівацца. Праціўнік, імкнучыся контратакамі спыніць наша наступленне, несучы вялікія страты, прадаўжаў адступаць. Нашы часці, заўладаўшы абарончымі пунктамі на паўночным берагу ракі Салмен-Кайта, заняі мястэчка Рыта-Саары, на заходнім берагу возера Вуоксі Ярві, далей занялі мястэчкі: Мількеля, Хамарын, Эмі і Хейкурыла. На поўнач ад возера Юрапян-Ярві-Кямяра ў 4-х кіламетрах на паўднёвы захад ад станцыі Хеннокі і Аля Сомме ў 6 кіламетрах на поўдзень ад Выбарга.

Па няпоўных даных, нашымі часцямі на працягу 28 лютага занята 42 абарончых умацаваных пункты праціўніка.

На астатніх участках фронта без істотных перамен.

З прычыны неспрыяючага надвор'я дзеянні нашай авіяцыі абмяжоваліся разведчымі палётамі.

Эканоміць сыравіну, паліва і дапаможныя матэрыялы

Гаспадарчае жыццё нашай вобласці хутка пераключаецца на новыя сацыялістычныя рэльсы, перамагаючы рад цяжкасцей пераходнага перыяда. Расце прадукцыйнасць працы на многіх тэкстыльных прадпрыемствах. Рабочыя ўсё больш і больш праяўляюць сацыялістычныя адносіны да працы. Дагаворамі аб сацыялістычным спаборніцтве ахоплен рад камбінатаў і фабрык.

Але пытанне далейшых гаспадарчых поспехаў і няўхільнага вытворчага ўздыму нашай прамысловасці цяснейшым чынам звязаны з беражлівымі, эканомнымі адносінамі да матэрыялаў, да сродкаў. Барацьба за рэжым эканоміі адыграла велізарную ролю ў пабудове велічнага будынка сацыялізма ў краіне Саветаў. Дзякуючы мэтазгоднаму і эканомнаму выкарыстанню велізарных рэсурсаў нашай радзімы, дзякуючы беражліваму выдаткаванню кожнай капейкі, працоўныя Савецкага Саюза пабудавалі буйнейшыя гіганты нашай прамысловасці.

У сваіх рашэннях XVIII з'езд партыі указаў, што неабходна „арганізаваць рашучую барацьбу з безгаспадарчасцю, прастоямі і стратамі ў вытворчасці, знізіць нормы выдаткавання сыравіны, матэрыялу, паліва, электраэнергіі; шырока выкарыстаць адыходы вытворчасці і нізкасортную сыравіну“.

Пры панаванні капіталістаў аб барацьбе з безгаспадарчасцю не магло быць і гутаркі. Фабрыкі, з прычыны настаўных крызісаў, не маглі выкарыстаць сваю вытворчую магутнасць. Дробныя тэкстыльныя прадпрыемствы Беластока з незаконнычаным тэхналагічным працэсам знаходзіліся на адлегласці цэлых кіламетраў адно ад другога, складалі адну суцэльную карціну безгаспадарчасці, хаоса і бясплановасці. Зусім зразумела, што пры капіталістах інжынеры, служачыя і майстры, не гаворачы ўжо аб рабочых, не былі і не маглі быць зацікаўлены ў беражлівых адносінах да сыравіны і дапаможных матэрыялаў, у рацыяналізацыі вытворчых працэсаў, якія служылі выключна крыніцай нажывы для фабрыкантаў.

З моманту нацыяналізацыі фабрык і іх пераходу на планавую сацыялістычную вытворчасць рабочыя і ІТР пачалі барацьбу са спадчынай капіталістычнай безгаспадарчасці. На фабрыках наведзен парадак. Паляпшаецца догляд за сыравінай.

Тэкстыльны трэст зусім правільна зрабіў, калі прыступіў да загатоўкі шэрсці ў заходніх абласцях БССР. Гэту справу трэба ўсямерна разгортваць, ствараючы такім чынам дадатковыя рэсурсы сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці.

На тэкстыльных прадпрыемствах навучыліся максімальна эканоміць дэфіцытную соду, а на другім камбінаце не сталі паспяхова замяняць таннай і даступнай глінкай.

На тэкстыльнай фабрыцы № 13 беражліва расходуюць паліва. Там штодзённа рэгулююць паравое ацяпленне ў залежнасці ад атмасферных умоў, стараючыся эканоміць пабольш дроў.

Маюцца яндрэнныя прыклады эканоміі грашовых сродкаў. Трэці тэкстыльны камбінат выканаў план за студзень на 134,3 процанта па пражы і на 121,4 процанта па сураўю. Пры гэтым выдаткована 249.601 рубель з фонда заработнай платы замест 250.300 рублёў, прадугледжаных па плану.

Разам з гэтым мы маем цэлы рад адмоўных фактаў, якія сведчаць аб тым, што некаторыя гаспадарнікі не змагаюцца за беражлівыя і эканомныя адносіны да матэрыялаў, сыравіны і паліва.

На радзе фабрык ёсць выпадкі, калі сыравіна ў мяшках ляжыць на фабрычным двары і траціць сваю якасць і вагу. Прыклады дрэннага догляду за сыравінай мелі месца на 17 і 5 камбінатах.

Усё яшчэ недастаткова вядзецца барацьба за поўнае і рацыянальнае выкарыстанне сыравіны, за максімальнае зніжэнне калькасці і даўжыні так званых канцоў. Не арганізавана барацьба за зніжэнне процанта чаду, у выніку адсутнасці ўчоту і на асобных прадпрыемствах і ў самім трэсце.

Добрыя вынікі, дасягнутыя асобнымі прадпрыемствамі па лініі ўжывання глінкі замест дэфіцытнай соды, не абагульняюцца для іх прымянення ва ўсёй тэкстыльнай прамысловасці.

Зусім недастаткова вядзецца барацьба са стратамі на вытворчасці, у выніку так званых тэхнічных прастояў. Адсутнасць механічных майстэрань на цэлым радзе тэкстыльных фабрык, напрыклад, №№ 18 і 29 перашкаджаюць своечасоваму рамонту пашкоджаных станкоў, што прыводзіць да частых прастояў.

Недапушчальныя з'явы маюць месца ў энергетычнай і паліўнай гаспадарцы. Так, на 5 м камбінаце на цэлы месяц спынілі вялікі кацёл з ціскам у 10 атмасфер, ачыстку якога ўсё яшчэ не закончылі. У гэты-ж час карысталіся малым катлом з ціскам у 4 атмасферы, на які патрачана непрапарцыянальная колькасць паліва. На механічным заводзе № 35 атапліваюць ліцейны цэх дэфіцытным коксам, неабходным для самога працэса плаўкі і г. д.

Пара павесці рашучую барацьбу з такімі з'явамі. Пара разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу сярод рабочых і ІТР за самае беражлівае і рацыянальнае расходванне сыравіны, дапаможных матэрыялаў і паліва. Трэба ўсямерна разгарнуць вынаходніцкую думку рабочых і ІТР для шырокага прымянення рацыяналізатарскіх метадаў і зніжэння сабекошту. Дадзім краіне больш тавараў і добрай якасці.

ПАСТАНОВА
ГАЛОЎНАГА КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ АД 20 ЛЮТАГА 1940 г.

Узнагародзіць удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі — старшынь калгасаў, дырэктараў машынна - трактарных станцый і саўгасаў, спецыялістаў, перадавікоў і арганізатараў сельскай гаспадаркі, паказаўшых лепшыя ўзоры работы.

ПА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВЯЛІКАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Азаркевіч Уладзіміра Пятровіча
2. Агурэцкую Марыю Васільеўну
3. Русак Ілью Тарасавіча
4. Цішкіну Ефрасінню Нікалаеўну

МАЛАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Аблавацкую Екацярыну Сцяпанаўну
2. Бабошка Івана Васільевіча
3. Бадзінка Леона Паўлавіча
4. Булаеву Анастасію Егораўну
5. Лысенка Кандрація Ефімавіча
6. Малаток Леона Лаўрэнцьевіча
7. Подаву Феадосію Іванаўну
8. Разумава Мітрафана Міхайлавіча
9. Сафроненка Уладзіміра Іларыёнавіча
10. Умецкага Купрыяна Сцяпанавіча

ПА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВЯЛІКАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Ачкуляс Пелагею Дзмітрыеўну
2. Саўкова Макара Астапавіча
3. Чорнагаловага Андрэя Карнеевіча

МАЛАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Асонава Канстанціна Анісімавіча
2. Доўгага Арсенція Арсенцьевіча
3. Засядацелева Івана Гаўрылавіча
4. Ісценкова Ефіма Аляксеевіча
5. Маркаўцову Анну Дзмітрыеўну
6. Мандрыкаву Агаф'ю Пятроўну
7. Саранчук Марыну Арцёмаўну

ПА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВЯЛІКАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Анісімава Цімафея Дзмітрыевіча
2. Ансілеўскага Антона Францавіча
3. Вашкевіч Анастасію Іосіфаўну
4. Бейня Сяргея Іосіфавіча
5. Жура Уладзіміра Нікіціча
6. Закрэўскага Адама Фаміча
7. Лічко Разалію Андрэеўну
8. Шахоцька Дзмітрыя Фёдаравіча

МАЛАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Акімовіч Ольгу Міронаўну
2. Валкадава Івана Кірылавіча
3. Врублеўскую Еўдакію Іларыёнаўну

4. Гаўрона Пятра Пятровіча
5. Жалкоўскую Анну Антонаўну
6. Жылку Пятра Нікалаевіча
7. Казючыц Галіну Іванаўну
8. Казючыц Івана Грыгор'евіча
9. Каваленю Паўла Міхайлавіча
10. Леановіча Трафіма Паўлавіча
11. Міхалюка Аляксея Пятровіча
12. Пінскага Піню Мендзелеевіча
13. Сюбараву Эму Пятроўну
14. Цішкевіч Елену Сямёнаўну
15. Хабенка Кірыла Калінікавіча
16. Чыжык Анну Аляксееўну

ПА МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВЯЛІКАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Бабошу Ульяну Сяргееўну
2. Карнееву Фёклу Клімецьеўну
3. Чарнецкую Ефрасінню Герасімаўну

МАЛАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Аўдзеенка Сямёна Нікіфаравіча
2. Андрэенка Кузьму Сцяпанавіча
3. Балашэнка Пракофія Герасімавіча
4. Бакура Марфу Мінаўну
5. Васільеву Ульяну Філіпаўну
6. Гаўрыленка Васілія Парфенавіча
7. Ганакову Праскоўю Леонаўну
8. Гаваркову Анастасію Сямёнаўну

ПА ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВЯЛІКАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Бабарыка Ульяну Грыгор'еўну
2. Дзялец Нікалая Сідаравіча
3. Ганчарова Аўраама Андрэевіча

МАЛАЙ ЗАЛАТОЙ МЕДАЛЛЮ

1. Гардзейчык Анастасію Сільвестраўну
2. Кароль Нікадзіма Дзем'янавіча
3. Сапота Архіпа Прохаравіча
4. Сурду Аляксандру Аўраамаўну
5. Тарасюк Пантелея Іванавіча

Узнагароджаныя залатымі медалямі адначасова атрымліваюць прэмію: пры атрыманні Вялікай златой медалі прэмію — 3.000 рублёў і пры атрыманні Малай залатой медалі прэмію — 2.000 рублёў.

(«Праўда» 27 лютага).

ПЕРАД СЯЎБОЙ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР

Працоўнае сялянства заходніх абласцей БССР з уздымам рыхтуецца да першай бальшэвіцкай вясны. Дзякуючы савецкай уладзе працоўнае сялянства былой Заходняй Беларусі атрымала ў сваё карыстанне 358.000 гектараў памешчыцкай зямлі, 25.496 кароў, 10.400 коней. Цяпер зямлёй і яе пладамі карыстаецца той, хто працуе на ёй. Сялянам больш не прыдзецца працаваць на сваіх эксплаататараў, на сваіх заклятых ворагаў — памешчыкаў і асаднікаў.

Бальшэвіцкая партыя, савецкі ўрад аказваюць велізарную дапамогу заходнім абласцям у падрыхтоўцы і правядзенні сяўбы. Рад цікавых даных аб гэтай дапамозе паведаміў нашаму карэспандэнту намеснік наркома земляробства БССР тав. І. К. Жыткоў.

— Бядняцка-серадняцкая частка сялянства заходніх абласцей БССР праяўляе вялікае жаданне ўступіць у калгасы. Зямельныя органы атрымліваюць шматлікія заявы ад сялян з просьбай дапамагчы арганізаваць сельскагаспадарчыя арцелі. Рух за арганізацыю калгасаў вельмі вялікі. Па адной толькі Брэсцкай вобласці паступілі 102 заявы, якія падпісалі 5036 сялян. 102 вёскі гэтай вобласці настойліва патрабуюць аказання дапамогі ў стварэнні сельскагаспадарчых арцеляў. Рад калгасаў ужо ўзніклі і просяць прыслаць ім прыкладныя нормы выпрацоўкі ў калгасах, кнігі ўчота і справаздачнасці. Наркамзем БССР паслаў у раёны 10.000 экземпляраў брашур з прыкладным Статутам сельскагаспадарчай арцелі.

У гэтым годзе ў заходніх абласцях БССР ствараецца 101 машынна-трактарная станцыя. Кожны раён будзе мець машынна-трактарную станцыю. Для кожнай з іх будзе завезена па 10 трактараў і прычэпны інвентар — плугі, сеялкі, малацілкі і т. д. У першую чаргу машынна-трактарныя станцыі дапамогуць у апрацоўцы зямлі ўноў арганізаваным калгасам, а таксама былым батракам, атрымаўшым зямлю, і сялянам, якія не маюць коней. Да веснавой сяўбы арганізуюцца 5 машынна-трактарных майстэрань.

Праводзіцца вялікая работа па падрыхтоўцы кадраў да веснавой пасяўной кампаніі. У заходніх абласцях на 15-дзённых курсах перападрыхтаваны ўжо 550 мясцовых сельскагаспадарчых спецыялістаў — аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных урачоў. Яны вывучылі Канстытуцыі СССР і БССР, прыкладны Статут сельскагаспадарчай арцелі, знаёміліся з дасягненнямі агратэхнікі ў Савецкім Саюзе. Цяпер у абласцях адкрыліся курсы трактарыстаў, якія падрыхтуюць 794 чалавек. Цікавасць да гэтых курсаў, асабліва сялянскай моладзі, велізарная. Колькасць заяў перавысіла лік месц. У Валкавыску навучаецца 184 чалавекі, у Глыбокім —150. У Пінск на курсы трактарыстаў з'ехаліся з раёнаў 150 чалавек, у тым ліку 18 жанчын. За час сваёй вучобы слухачы авалодаюць трактарам, азнаёмяцца з іншымі сельскагаспадарчымі машынамі.

Апрача таго, у школах механізатараў сельскай гаспадаркі ўсходніх абласцей рэспублікі будуць падрыхтаваны для заходніх абласцей 750 трактарыстаў, камбайнераў, механікаў. У Смалявічы для вучобы ў школе механізатараў прыбыла з Вілейскай вобласці першая група ў саставе 43 чалавек. У сучасны момант ва ўсіх раёнах заходніх абласцей праводзяцца кароткатэрміновыя курсы для сялян-актывістаў. Да канца сакавіка праз гэтыя курсы будзе прапушчана звыш 5 тыс. чалавек.

Працоўнае сялянства заходніх абласцей горача адабрае і падтрымлівае ўсе мерапрыемствы савецкай улады, накіраваныя да паспяховага правядзення першай бальшэвіцкай вясны.

ПА САВЕЦКАМУ САЮЗУ

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ ПЛАН

Масква, 28 лютага ўвесь камбінат Трохгорнай мануфактуры імені Дзяржынскага датэрмінова закончыў лютаўскую вытворчую праграму.

Датэрмінова выканаў 28 лютага месячны план калектыў Маскоўскай кандытарскай фабрыкі «Бальшэвік».

КАМПЛЕКТЫ ДЭТАЛЕЙ ДЛЯ СКАРАСНОГА БУДАЎНІЦТВА ДАМОЎ

Куйбышэў. Лесазаводы Куйбышэўскага трэста Цэнтрабуддэталь падрыхтавалі першыя 170 камплектаў дэталей для мантажа 4-х, 8-і і 16-кватэрных дамоў. У кожным доміку 4 кватэры: зал, спальня, кухня і ванная.

УРАЛЬСКІЯ СКРЫПКІ

Свярдлоўск. Сталяр І. Ф. Калабоў у Пышвінскай лесапрамысловай арцелі імені Кірава (Свярдлоўская вобласць) наладзіў вытворчасць скрыпак. Прафесар Свярдлоўскай кансерваторыі гав. Лідскі даў станоўчую ацэнку якасці скрыпак уральскага майстра-самавучкі.

БУДАЎНІЦТВА РЭГЕНЕРАТАРНА - ГУМАВАГА КАМБІНАТА

Кіеў. У Дарніцы будуецца першы ў Савецкім Саюзе рэгенератарна-гумавы камбінат. Усе хімічныя працэсы механізуюцца. У другім квартале 1940 года камбінат будзе здан у эксплаатацыю.



На здымку: Герой Савецкага Саюза чырвонаармеец І. М. Ульянаў гутарыць са сваімі сябрамі. Злева направа: І. М. Ульянаў, малодшы камандзір К. Д. Бадхан і чырвонаармеец Н. Н. Іўлеў.

(Фота-кліша ТАСС).

64 МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ НА РАСШЫРЭННЕ ІШЫМБАЕЎСКІХ НАФТА-ПРОМЫСЛАЎ

Куйбышэў. Куйбышэўскі трэст у гэтым годзе ўкладвае ў капітальнае будаўніцтва Ішымбаеўскіх нафтапромыслаў 64 мільёны рублёў. Значная сума будзе выдаткавана на механізацыю нафтадабычы і асваенне новых месцанараджэнняў.

866 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ ТЭРМІНОВЫХ УКЛАДАЎ

У апошні час нагляднa павялічыўся рост тэрміновых укладаў у ашчадныя касы. Толькі за студзень працоўнымі здана на зберажэнне ў ашчадкасы звыш 82 мільёнаў рублёў. Агульная сума тэрміновых укладаў у ашчадных касах да 1 лютага дасягнула 866 мільёнаў рублёў. Па тэрміновых укладах, якія захоўваюцца ў ашчадкасах не менш 6 месяцаў, укладчыкі атрымоўваюць павышаны прыбытак у размеры 5 проц. гадавых.

МАТЧ НА ЗВАННЕ ГРОСМАЙСТРА

28 лютага даігрывалася шостая адкладзеная партыя матча Левенфіш—Алаторцаў. На 53 хаду шахматысты згадзіліся на нічыю. Такім чынам пасля 6 праіграных партый у лік матча 3, 5:2, 2,5 у карысць Левенфіша.

НОВЫЯ ЧЭМПІЁНЫ СССР ПА ЛЫЖАХ

28 лютага закончыўся розыгрыш першынства СССР па лыжах.

Званне чэмпіёна СССР па лыжах заваявалі ў мужчын прадстаўнікі Чырвонай Арміі лейтэнант Карпаў (на дыстанцыю ў 50 кіламетраў) і заслужаны майстар спорта Дзмітрый Васільеў (на 20 кіламетраў), а ў жанчын — Валенціна Блажэннава (на 5 кіламетраў) і Марыя Пачотава (на 15 кіламетраў). Каманднае першынства ў рэзультаце 5 дзён спаборніцтваў выйгралі спартсмены «Дынама».

28 лютага закончыліся ўсесаюзныя спаборніцтвы лыжнікаў - калгаснікаў. У гэты дзень у жанчын разыгрывалася дыстанцыя ў 5 кіламетраў, а ў мужчын — у 20 кіламетраў.

У жанчын пераможніцай аказалася Шчадрова (таварыства «Восход»). Яна фінішыравала з добрым рэзультатам — 23 мін. 41 секунда. У мужчын дыстанцыю ў 20 кіламетраў выйграў лыжнік таго-ж таварыства Войнаў. Яго час — 1 гадзіна 35 мінут 27 секунд.

Каманднае першынства па групе калгасаў пасля двух дзён спаборніцтваў выйгралі спартсмены Маскоўскай вобласці. На другім месцы лыжнікі Марыйскай АССР, на трэцім — Казахстана. Па групе калгасаў і добраахвотных спартыўных таварыстваў першынства заваявала каманда таварыства «Восход».

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 351 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ЗА ВЕРНАГА СЫНА ПРАЦОЎНАГА НАРОДА, НІКАЛАЯ СЦЯПАНАВІЧА ІВАНОВА

ВЫБАРШЧЫКІ 361 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ВЕРНАГА СЫНА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ, АЛЕКСАНДРА НІКІФАРАВІЧА ЧЭРНІКОВА

Нікалай Сцяпанавіч Іваноў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Гэта было за год да прыходу Чырвонай Арміі. Пяты дзень працягвалася забастоўка на беластоцкім [illegible] заводзе, які належаў фабрыканту Дайлідскаму. Пяты дзень рабочыя не пакідалі завода. [illegible] ... пад галаву замест падушкі металічныя [illegible] ...

Забастоўка ўзнікла з-за адмаўлення гаспадара працы [illegible] рабочым [illegible] водпуску [illegible] скі.

Нават польскі „інспектар працы“, да якога звярнуліся рабочыя, „звоніў“ гаспадару, што водпуск варта даць, або па крайняй меры заплаціць за яго. Гаспадар лічыў наадварот.

— Ні водпуску, ні грошай вы не атрымаеце, — заявіў ён дэлегацыі рабочых. — А калі вам не падабаецца, — ідзіце да д'ябла, — калі ласка, чакайце за [illegible] чаргам. Знайду другіх рабочых. Дзякуй богу, беспрацоўных дастаткова ў Беластоку.

Не было другога выхаду, як пачаць «італьянскую» забастоўку: ні на адну мінуту нельга было пайсці з завода. Рабочыя ведалі, што гаспадар здолен выканаць сваю пагрозу і ўзяць на іх месца штрэйкбрэхераў.

Пяты дзень бастуюць рабочыя, але гаспадар не ўступае.

Як цені, ходзяць рабочыя па заціхлых цэхах. Па іх пахудзеўшых тварах і ўпаўшых шчоках відаць, што яны галадаюць. Іх жонкі і дзеці стаяць за [illegible] і не могуць перадаць нават сваім мужам і бацькам. Пан Дайлідскі замкнуў вароты на ключ і нікога не пускае на завод.

З дня ў дзень падаюць сілы, слабее мужнасць рабочых.

— Нічога не паробіш, — гавораць ужо некаторыя (найбольш слабыя з бастуючых, — паздыхаем тут з голаду. Трэба здацца, спыніць забастоўку і вярнуцца да работы.

Калі рабочыя на пяты дзень не пакінулі завода і працягвалі сваю ўпартую, здавалася, безнадзейную барацьбу з панам Дайлідскім, калі яны не здаліся, то ўся гэтым выключная заслуга кіраўнікоў забастоўкі.

Адным з кіраўнікоў забастоўкі быў рабочы-слесар Нікалай Сцяпанавіч Іваноў.

На шосты дзень гаспадар здаўся. Ён пабаяўся, што многа траціць прыбыткаў і пайшоў на уступкі.

Рабочыя атрымалі аплату за двухтыднёвы адпачынак і вярнуліся да сваіх станкоў.

Нікалай Сцяпанавіч Іваноў [illegible] ...



...чалавек не малады: яму зараз 53 гады.

21 рубель 75 капеек зарабляў яго бацька, чыгуначны кандуктар, калі нарадзіўся Нікалай. За гэтыя 21 руб. 75 кап. жыло 7 чалавек: Сцяпан Іваноў, яго жонка і пяцёра дзяцей.

Нікалай скончыў два класы царкоўна-прыходскай школы і паступіў у рамесніцкае вучылішча. Але маладому Іванову не ўдалося скончыць гэтага вучылішча. Яго бацьку перавялі з Вільна у Беласток. І без таго дрэннае матэрыяльнае становішча сям'і яшчэ больш пагоршылася. 16-гадовы Нікалай быў вымушан шукаць работу.

У 1904 годзе ён паступае падручным слесара ў чыгуначную майстэрню на станцыі Лапы, дзе зарабляе 45 капеек у дзень. Так пачалося працоўнае жыццё Нікалая Сцяпанавіча Іванова.

Да 1921 года Іваноў працуе на чыгунцы памочнікам машыніста, потым слесарам, аглядчыкам вагонаў і г. д. У гэтым-жа годзе па сямейных абставінах ён пераязджае ў Беласток.

Цяжка жылося Іванову ў Беластоку. Першыя тры годы ён быў беспрацоўным. У пошуках якога-небудзь заробку Іваноў, высока кваліфікаваны слесар, браўся за ўсякую работу: сек дровы, насіў цэглу.

Голад панаваў тады ў сям'і Іванова.

У 1924 г. Іваноў паступае на работу на [illegible] завод Дайлідскага. У 1926 г. Іваноў смела выступае з патрабаваннем прыбавіць заработную плату. У адказ на гэта патрабаванне гаспадар звальняе яго з работы. Але Дайлідскі ведае, што Іваноў — добры спецыяліст сваёй справы, і таму праз два гады прымае яго зноў на завод.

З таго часу Іваноў працуе безперапынна на гэтым заводзе [illegible] ... Акрамя таго, Іваноў выконвае зараз абавязкі машыніста-качагара. На заводзе нядаўна ўстаноўлен новы кацёл і дырэктар завода даручыў догляд за катлом Іванову.

Іваноў карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых завода. Усе яны без выключэння бачаць у ім не толькі аддадзенага таварыша, але і кіраўніка. Рабочыя добра памятаюць ролю, якую адыграў Іваноў у час забастоўкі. Два месяцы таму назад яго выбралі старшынёй заўкома.

Як старшыня заўкома, Іваноў клапоціцца аб патрэбах рабочых: ён наведвае хворых, хадайнічае перад дырэкцыяй фабрыкі аб выдачы дапамогі адчуваючым у ёй патрэбу. Дзякуючы яго намаганням адзін з старых рабочых завода атрымае ў бліжэйшы час пуцёўку на курорт.

Асноўная рыса Іванова гэта — скромнасць. Аб сабе ён гаворыць вельмі мала. Гэта чэсны, скромны труджанік, бязмежна адданы рабочаму класу.

Гэта ведаюць рабочыя. Таму 21 лютага на прадвыбарчым сходзе рабочы тав. Карпішук сказаў: «Вылучаючы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Іванова, я ўпэўнен у тым, што ён будзе чэсна абараняць нашы інтарэсы, як чэсна зараз працуе на вытворчасці».

Выступаючы на гэтым-жа сходзе тав. Іваноў заявіў:

— Я не аратар. Я вырас не пры совецкай уладзе і не меў магчымасці, як след, вучыцца. Але адно вам абяцаю: быць верным да канца справе рабочага класа.

Нікалай Сцяпанавіч Іваноў, рабочы слесар беластоцкага гвалдзільнага завода № 1, апраўдае высокае званне дэпутата соцыялістычнага парламента.

Л. Бемаў.

Александр Нікіфаравіч Чэрнікоў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Ішоў 1920 год. Чырвоная Армія, разграміўшы другі паход Антанты, пераможна наступала на банды польскіх інтэрвентаў. Адным з палкоў Чырвоных войск камандаваў Александр Нікіфаравіч Чэрнікоў.

Слаўныя баявыя традыцыі меў полк: байцы і камандзіры на полі бою не раз праяўлялі бязмежную мужнасць, стойкасць і бясстрашша. І туды, дзе было асабліва цяжка, пасылалі слаўных вайскоўцаў: полк насіў імя стойкага бальшавіка Валадарскага. [illegible] ... Смаленска.

Прадстаяла цяжкая, адказная аперацыя. Полк ішоў напралом. Усё глыбей і глыбей пранікаў ён у польскі тыл. Рашучым ударам захвачана станцыя Новаельная. Лінія на Нёман была прарвана. Узяты вялікія ваенныя трафеі: абозы, узбраенне, палонныя.

За гераізм, доблесць, ініцыятыву полк быў узнагароджан ордэнам «Чырвонага сцяга». Камандзір палка тав. Чэрнікоў атрымаў высокую ўзнагароду — ордэн «Чырвонага сцяга».

...Нарадзіўся Александр Нікіфаравіч у сям'і селяніна. З вялікай цяжкасцю сын селяніна, унук прыгоннага, дабіўся сярэдняй асветы. Ён стаў вясковым настаўнікам.

Дзетвара вёскі Палуіна, Балашоўскага павета, добра ведала і любіла свайго сябра і выхавацеля. Уважліва адносячыся да сваіх абавязкаў, ён у той-жа час, чым мог, дапамагаў беднаце. Пяць год працаваў настаўнікам Александр Нікіфаравіч.

Пачалася імперыялістычная вайна. Прызваў у царскую армію: спачатку радавы, затым ефрэйтар, трохмесячная школа прапаршчыкаў, і Чэрнікоў — малодшы афіцэр вучэбнай каманды. А праз кароткі час — ён на поўднёва-заходнім фронце.

Чэрнікоў хутка заваяваў аўтарытэт у любога салдата. Гэта не чужы для іх чалавек другога класа. Не, гэта свой родны брат. Чутка клапатліва адносіцца ён да падначаленых. Зразумела, што афіцэры — сынкі памешчыкаў і фабрыкантаў — цураліся яго, не жадалі пускаць у сваю кампанію. Ён і не імкнуўся к гэтаму, лічаў за лепшае праводзіць час з салдатамі, блізкімі, роднымі яму па крыві, па духу.

Прышоў 1917 год. Самадзяржаўе рухнула. Вестка аб гэтым не хутка дакацілася да далёкага фронта. Генералы скрывалі ад салдат праўду. Але праўда усё-ж пранікла ў салдацкія масы. У гэты час салдаты аднадушна выбралі Чэрнікова камандзірам батальёна.

У часці былі моцныя рэволюцыйныя настроі. У здрадніцкае чэрвеньскае наступленне, арганізаванае контррэволюцыйным урадам Керанскага, полк не пайшоў.

Дэмабілізаваўшыся пасля працяглага лячэння ў шпіталі, Александр Нікіфаравіч звярнуўся да сябе на радзіму ў сяло Церсу, Аткарскага раёна. Праз кароткі час рэўком назначыў яго камандзірам роты, якая ў далейшым улілася ў дывізію ім. Кікведзе.

У верасні 1919 года тав. Чэрнікоў — памочнік камандзіра 187 стралковага палка ім. Валадарскага, затым ён камандзір гэтага палка, застаўшыся ім нязменна да канца грамадзянскай вайны.

Многа яркіх старонак упісаў гэты слаўны баявы полк у гісторыю абароны краіны Советаў. Ні аднаго паражэння, толькі перамогі азнаменоўвалі яго шлях. Не мала ўдараў было ім нанесена палякам на лініі Навахопёрск—Новарасійск.

Добра знаёмы землі Заходняй Беларусі камандзіру Чырвонай Арміі Чэрнікову. Вось, ва ўпартым баі з белапалякамі полк пад яго кіраўніцтвам узяў у 1919 годзе Бельск, Вялікія баі вялі за Беласток. Польскае афіцэрства моцна адчула гады [illegible] ... Скончылася грамадзянская вайна. Здольны, валявы камандзір Чэрнікоў імкнецца павысіць свае ваенныя веды. Тры годы вучобы ў ваеннай акадэміі ім. М. В. Фрунзе значна расшыраюць яго кругагляд, узбагачаюць яго палаткі ў ваенным мастацтве.

Лепшай адзнакай яго паспяховай вучобы можа паслужыць давер'е, аказваемае яму ўрадам. Па сканчэнні акадэміі Чэрнікоў на працягу двух год выконвае ўрадавае адказнае заданне.

На любым участку, куды пасылала Чэрнікова партыя і ўрад, ён працуе, не пакладаючы рук, увесь аддаецца любімай справе.

З 1928 года тав. Чэрнікоў член ВКП(б).

Верны сын народа Александр Нікіфаравіч Чэрнікоў усім сваім жыццём, усёй сваёй работай пакажа сябе дастойным быць выбраным у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

П. Кліфрук, І. Жаркоўскі.

Увядзенне ўсеагульнай абавязковай і бясплатнай асветы ў заходніх абласцях БССР

Совет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову аб развіцці народнай асветы ў заходніх абласцях БССР.

Усе школы прызнаны дзяржаўнымі, і ўтрыманне іх прынята на дзяржаўны кошт. На ўсёй тэрыторыі заходніх абласцей БССР уводзіцца ўсеагульная абавязковая бясплатная асвета: у сельскіх мясцовасцях — абавязковая асвета за пачатковую школу, у гарадах — за сямігадовую школу. Уводзіцца сумеснае навучанне вучняў, ліквідавана дзяленне школ на мужчынскія і жаночыя.

На падставе артыкула 99 Канстытуцыі БССР спыняецца выкладанне рэлігіі і выкананне рэлігійных абрадаў ва ўсіх школах заходніх абласцей БССР.

Ідучы насустрач патрабаванням і інтарэсам беларускага працоўнага насельніцтва, Соўнаркам прапанаваў Наркамасветы пры размяшчэнні школьнай сеткі адкрываць пераважна беларускія школы, забяспечыць іх беларускімі падручнікамі і кваліфікаванымі выкладчыкамі.

Уводзіцца вывучэнне рускай мовы ў беларускіх і нацыянальных школах з трэцяга класа; вывучэнне беларускай мовы ў рускіх школах — з трэцяга класа, у нацыянальных школах — з другога класа.

„Поўшэхныя“ школы першай ступені рэарганізуюцца ў пачатковыя школы, школы другой і трэцяй ступені — у няпоўныя сярэднія, гімназіі і агульнаадукацыйныя ліцэі — у сярэднія школы.

Адначасова ствараецца сетка школ для дарослых і падлеткаў і школ па ліквідацыі неписьменнасці і малапісьменнасці.

Зацверджана адкрыццё педагагічнага інстытута ў горадзе Беластоку і трох настаўніцкіх інстытутаў у гг. Пінску, Баранавічах і Гродна. Зацверджана таксама адкрыццё 6 педагагічных вучылішчаў у гарадах Беластоку, Гродна, Навагрудку, Пінску, Брэсце і Маладзечна і двух дашкольных педагагічных вучылішчаў у гг. Ваўкавыску і Лідзе.

Усе функцыяніруючыя на тэрыторыі заходніх абласцей БССР рамесніцкія і іншыя спецыяльныя школы перададзены адпаведным гаспадарчым наркаматам БССР. Гэтыя школы да 15 сакавіка 1940 года будуць рэарганізаваны па тыпу тэхнікумаў і ФЗВ.

Наркамасветы БССР прапанавана арганізаваць у гэтым годзе ў заходніх абласцях БССР сетку дашкольных установ і дзіцячых дамоў. Для гэтай мэты будуць выкарыстаны былыя памешчыцкія дамы і асабнякі, якія перайшлі ў дзяржаўную ўласнасць.

Ва ўсіх абласных цэнтрах заходніх абласцей БССР арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы настаўнікаў і выхавацеляў для дашкольных устаноў.

ВЫБАРЧЫ ЎЧАСТАК ПАВІНЕН СТАЦЬ ЦЭНТРАМ УСЕЙ ПРАДВЫБАРЧАЙ РАБОТЫ

НА ЎЧАСТКАХ ПРОЛЕТАРСКАЙ АКРУГІ

Толькі маленькая шыльда, прымацаваная да акна, гаворыць аб тым, што тут змяшчаецца Пролетарская выбарчая акруга па выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Тут-жа і выбарчы ўчастак № 54.

Удзень тут нікога не сустрэнеш: ні старшыні, ні намесніка, ні сакратара. Участак зачынен. Работа ў ім распачынаецца толькі ўвечары.

Да гэтага часу на многіх участках не ўстаноўлены дзяжурствы, і выбаршчыкі не маюць магчымасці днём зайсці праверыць сябе ў спісках, атрымаць адказы на запытанні.

Увечары на 51 участку сабраліся агітатары. Намеснік старшыні камісіі тав. Новікаў дае ім канкрэтныя заданні. Агітатарамі ўчастак забяспечан поўнасцю. Тут прыцягнуты да работы лепшыя рабочыя камбіната № 1, мэблевай фабрыкі і іншыя актывісты. З імі былі праведзены два семінары.

— Мы, — гаворыць тав. Новікаў, — зараз разбіваем гурткі. Там, дзе на вялікую колькасць жыхароў прыходзіўся толькі адзін агітатар, зараз працуе два-тры. Гэта дае магчымасць зрабіць агітацыйную работу больш даходлівай.

Галоўны ўпор у агітмасавай рабоце зараз звернут на глыбокае вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі, Палажэння аб выбарах. Асаблівая ўвага звяртаецца на растлумачэнне тэхнікі галасавання і азнаямленне выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў. Кожны агітатар атрымаў ужо біяграфічны нарыс кандыдата народа і знаёміць з ім выбаршчыкаў.

Спіскі выбаршчыкаў яшчэ не ўсюды вывешаны. 53 і 54 участкі толькі 28 лютага завярнулі іх у гарвыканкоме.

Трэба адзначыць, што гарвыканком даў не ўсім дакладныя спіскі. На 51 участку ў спісак не былі ўнесены жыхары 6 дамоў. Многа ёсць недакладнасцей у прозвішчах і імёнах. Гэта патрабавала многа часу, каб іх выправіць. У спісках 54 участка таксама многа недакладнасцей.

Выбарчыя ўчасткі яшчэ недастаткова абсталяваны. Толькі цяпер вядзецца работа па ўпрыгожванню іх знадворку і ў памяшканні. Набываецца неабходная літаратура. Трэба хутчэй ператварыць участкі ў цэнтр агітацыйна-масавай работы.

А. Якаўлеў.

Ліквідаваць недахопы

Выбарчы ўчастак № 66 Цэнтральнай выбарчай акругі размясціўся па Совецкай вуліцы № 46, у будынку 23-й школы. Аднак, не гледзячы на дакладны адрас, памяшканне выбарчага ўчастка не лёгка знайсці. Нумарацыя дома адносіцца да старой назвы вуліцы. Калі выбаршчык ідзе на агітпункт, ён павінен распытваць у памяшканне школы, папасці ў некалькі казсаў. Няма паказальнікаў, няма шыльды. Аб такой простай і неабходнай справе на 66 выбарчым участку забылі.

Нарэшце вы трапляеце ў пакой, які належыць выбарчаму ўчастку. Якіясь шафы з глобусамі, шкілетамі, мінераламі, колбамі, прабіркамі і іншымі вучэбнымі прыладамі. Адзіны прызнак існавання выбарчага ўчастка — гэта лозунгі, але і яны напісаны неахайна, без любві да справы.

25 лютага на ўчастку вывесілі спіскі выбаршчыкаў. Гэтыя спіскі маюць вялікія недакладнасці. У многіх няма графы „імя па бацьку". Адчуваецца, што перад тым, як вывесіць гэтыя спіскі, участковая камісія не ўважліва правярала ўзвела іх.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай акругі № 353 тав. Бартноўскі ніяк не можа справіцца з размеркаваннем выбарчых лозунгаў па ўчастку. Ствараецца ўражанне, што выбарчая кампанія толькі ўчора пачалася.

З вялікім спазненнем з'явілася на ўчастак даверанае тав. Шумілінскі. Ён абмяжоўвае сваю работу тым, што 27 лютага расказаў членам участковай камісіі і агітатарам аб задачах выбарчай кампаніі і ролі агітатараў. Што-ж датычыцца галоўнага — непасрэднай работы з выбаршчыкамі, то тут амаль нічога не зроблена, калі не лічыць аднаго сходу з выбаршчыкамі, на якім зноў-такі гаварылі аб задачах выбарчай кампаніі.

Нашчот час, калі трэба пачаць агітацыю за кандыдатаў. Да выбарчага ўчастка прымацаваны 24 агітатары ад розных арганізацый горада. Сярод іх нямала вопытных і палітычна падрыхтаваных таварышоў. З такім агітколектывам можна было-б прарабіць вялікую работу. Аднак агітацыя за кандыдатаў у дэпутаты сярод выбаршчыкаў, па сутнасці, яшчэ не пачалася. Пара пакончыць з палітыкай выжыдання. Неабходна азнаёміць выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў, арганізаваць сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі. Час пачаць бальшавіцкую агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Н. Бражнікава.



Звыш 2 тысяч агітатараў працуе сярод насельніцтва гарадоў і вёсак Беластоцкай вобласці па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

На здымку: агітатары тэкстыльнага камбіната № 1 у г. Беластоку, комсамольцы (злева направа) В. К. Маркоўская, В. Ф. Міхсеенка і В. С. Дамідэнка — за падрыхтоўкай да заняткаў. (Фотахроніка БЕЛТА).

Арганізавана сустрэць выбары

Работа ўчастковай выбарчай камісіі № 74 (Совецкая акруга) на першы погляд стварае няблагае ўражанне. Памяшканне ўчастка ўпрыгожана партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, плакатамі. На сталах і ў вітрыне раскладзена выбарчая літаратура. Тут-жа арганізаваны стол кансультацыі і вітрына са спіскамі выбаршчыкаў.

28 лютага на ўчастку выпушчана насценгазета. На старонках газеты агітатары ўчастка таварышы Бабаеў, Герасімчык, Людамір і інш. дзеляцца вопытам сваёй работы з выбаршчыкамі і адначасова ўскрываюць адмоўныя бакі работы выбарчай камісіі. А недахопаў у рабоце камісіі многа. Галоўным з іх з'яўляецца неахайнае складанне спісаў выбаршчыкаў. Спіскі запоўнены брудна, неразборчыва. Парадкавыя нумары выбаршчыкаў месцамі надрукаваны машынкай, месцамі ад рукі чарнілам і алоўкам. Некаторыя выбаршчыкі, як напрыклад, тав. Антанюк запісаны ў спіску па 2 разы. Пры складанні спіскаў прапушчаны цэлыя сем'і. 12 выбаршчыкаў, пражываючых па Ленінскай вуліцы (дом № 39, кв. 8), зусім не занесены ў спіскі. Пры праверцы ў спісках таксама не аказаліся выбаршчыкі тт. Шварц Е. М., Украінскі Г., яго жонка і бацька, Штрон і іншыя. Гаварышкова Канель, Раеўскага і трох выбаршчыкаў Сакольскіх занеслі ў спіскі толькі па прозвішчу.

Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Хаймовіч спасылаецца на тое, што горсовет дрэнна склаў спіскі, не арганізаваў падворны абход для праверкі правільнасці складзеных спіскаў.

Большэвіцкая агітацыя за кандыдатаў, растлумачэнне выбаршчыкам Канстытуцыі і выбарчага закона рашае поспех выбараў. Гэта вялікая і адказная работа на выбарчым участку № 76 да апошняга часу не разгорнута. На ўчастку арганізавана 5 гурткоў. У іх займаецца толькі 110 чалавек. Астатнія 1.700 выбаршчыкаў агітацыяй не ахоплены. Агітатары не разгарнулі работы з выбаршчыкамі, а займаюцца пошукам памяшканняў для правядзення заняткаў.

На выбарчым участку 76 гэтай-жа акругі выбаршчыкі рэдкія госці. Тут штодзенна бывае не больш 3—5 чалавек. Старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Осіпаў і сакратар тав. Караваева адзываюцца «каму няма на ўчастках выбаршчыкаў». Адказ зусім просты. У памяшканні ўчастка не знойдзеш ні аднаго лозунга, ні плаката, нават нехапае стульляў, дзе-б мог прысесці выбаршчык. І самае галоўнае — на ўчастку адсутнічае цесная сувязь з выбаршчыкамі. Агітатары і члены камісіі рэдка бываюць у выбаршчыкаў.

Набліжаецца знамянальны дзень у жыцці народаў заходніх абласцей БССР — дзень выбараў прадстаўнікоў вызваленага народа ў соцыялістычны парламент. Гэты дзень патрэбна сустрэць па-большэвіцку. Арганізаваць работу так, каб усе выбаршчыкі прыйшлі да выбарных урнаў і аддалі свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Д. Казлоў.

РАЎНЯЦЦА ПА ПЕРАДАВЫХ

Здалёк відаць упрыгожаны дом № 8 на Модлінскай вуліцы. У гэтым доме размешчан 44 выбарчы ўчастак 351-й Чырвонаармейскай акругі па выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР. На сценах вісяць лозунгі і плакаты, партрэты правадыроў партыі і ўрада. На сталах многа літаратуры. Участковая камісія старалася стварыць утульную абстаноўку для выбаршчыкаў.

Па вечарах участак запаўняецца народам. Выбаршчыкі прыходзяць і чытаюць газеты, правяраюць вывешаныя на сценах спіскі, гутараць з прысутнымі членамі камісіі і агітатарамі.

Участак стаў цэнтрам агітацыйна-масавай работы. На ўчастку працуе 13 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. У кожным гуртку займаецца па 20—30 чалавек. Агітатары праводзяць індывідуальную работу сярод выбаршчыкаў, заходзяць да выбаршчыкаў, праводзяць гутаркі з хатнімі гаспадынямі.

27 лютага ў кватэры выбаршчыка Тавурына ў доме № 2 па вуліцы Сташыца была праведзена гутарка аб Канстытуцыі і аб выбарах. На гутарку прыйшлі амаль усе жыхары дома.

Добра працуе ўчастак № 45 Чырвонаармейскай акругі, які знаходзіцца ў памяшканні 13 школы. Там ужо былі праведзены 2 агульныя сходы выбаршчыкаў. Пасля сходаў выбаршчыкам была паказана мастацкая самадзейнасць, кіно-карціна і арганізаваны танцы. На кожным з гэтых сходаў прысутнічала звыш 350 чалавек.

На гэтым участку арганізавана 45 гурткоў. Заняткі ў гуртках праходзяць рэгулярна.

45 участак праводзіць сваю работу арганізавана. Штодзённа вечарам агітатары прыходзяць на ўчастак і дакладваюць аб праведзенай рабоце. Учот работы на ўчастку пастаўлен добра.

На жаль, не ва ўсіх участках Чырвонаармейскай акругі агітацыйная работа пастаўлена добра. У многіх участках нехапае агітатараў.

На 41 участку працуе 50 агітатараў. У пачатку сваёй работы яны арганізавалі 30 гурткоў. У большасці гэтых гурткоў праведзена па адным занятку і на гэтым работа ў гуртках спынілася. Да ўчастка прымацавана 10 чалавек з абласной пракуратуры. Але не адзін з іх не з'явіўся на ўчастак. Тое-ж самае з прымацаванымі да ўчастка работнікамі другога камбіната і гаркома МОПР'а. Такія безадказныя адносіны адмоўна адбіваюцца на рабоце ўчастка.

Не лепш арганізавана агітацыйная работа ў 46 і 47 выбарчых участках. Участковая камісія не ведае колькасці існуючых гурткоў, агітатары не прымацаваны да дамоў. Няма ніякага кантролю агітработы. На ўчастку не ўстаноўлена дзяжурства членаў камісіі. Старшыня камісіі не з'яўляецца па некалькі дзён на ўчастак і не ведае сапраўднага становішча работы на ім.

Выбаршчыкі гэтых участкаў не ведаюць свайго ўчастка, не ведаюць, дзе яны будуць галасаваць і хто іх кандыдат.

Рабочы-каменшчык тав. Наркевіч расказвае: «Былі ў мяне адзін раз, запісалі прозвішча, імя і год нараджэння і на гэтым скончылася. Я не ведаю, дзе знаходзіцца мой участак і за каго я буду галасаваць». Гэта самае гавораць на многіх кватэрах выбаршчыкаў.

Пара па-сапраўднаму разгарнуць прадвыбарчую работу на адстаючых участках. Да выбараў астаюцца лічаныя дні.

Л. Лірская.



На здымку: работніца Беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 1 агітатар Ф. Баршчэўская праводзіць гутарку аб Сталінскай Канстытуцыі на кватэры работніцы Л. А. Гельбарт. (Фотахроніка БЕЛТА).

ВЫЖЫДАЮЧЫЯ

У тэатральным зале аднаго з клубаў Ломжы сабраліся ўрачы, аграномы, настаўнікі, інжынеры, тэхнікі. Сход прысвечаны высуванню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

З трыбуны выступалі адукаваныя, мыслячыя людзі, якім палітыка, лёс краіны ніколі не былі абыякавымі. Аратары гаварылі прыкладна аб адным і тым-жа, але прамовы іх былі розныя не толькі па форме. Для адных улада советаў, дружба народаў, соцыялізм былі даўно і назаўсёды вырашанымі пытаннямі. Другіх прывёў на гэту трыбуну больш звілісты шлях. Яны даўно шукалі ісціну, кідаліся і туды і сюды і толькі цяпер, канцам сталі відушчымі, парываюць з мінулым. Прамовы гэтых людзей праўдзівыя, яны ідуць ад самага сэрца, якое клікча да будучыні, хоць і нялёгка аб мінулым. Але ёсць яшчэ адна катэгорыя аратараў — выжыдаючых.

Выкладчык матэматыкі Залеўскі яшчэ малады чалавек з румянцам на шчоках. Ён сядзіць у прэзідыуме схода ў другім радзе з краю, кутаецца ў кенгуравы кайнер і пазірае: то выцягне нагу, то ўвесь выгнецца, пагардна ссунуўшы бровы. У публіцы ў яго сябры і аднадумцы. Хай іх будзе нямнога, але ён, Залеўскі, лічыць абавязаным задаваць ім тон. Вось аратар гаварыў хвалюючыя словы. Быццам электрычная іскра прабегла па радах. Людзі ўскакваюць, б'юць у далоні, крычаць: «Няхай жыве!» Залеўскі застаецца сядзець, нацягнута ўсміхаючыся і пагладжваючы бародку.

Але вось Залеўскаму прадаставілі слова.

Ад чыйго імені ён рабіў прамову? Пілсудчык у мінулым, ён належыў к «легіёну младых». Гэта арганізацыя стаяла за «вызваленне Польшчы» ад панавання замежнага капітала ў інтарэсах капітала айчыннага. Легіянеры называлі сябе дзяржаўнымі нацыяналістамі і марылі «выканаць сваю вядучую ролю ў адносінах да славянскіх меншасцей і народаў, насяляючых прасторы ад Балтыкі да Чорнага мора». Легіён младых быў падначален Рыдза-Сміглы. Пад уплывам комсамола Залеўскі адышоў ад пілсудчыкаў, нават выступаў сведкай абароны ў працэсе Турлейскага. Але яго левізны хапіла ненадоўга.

Залеўскі гаварыў мінут 10, не сказаўшы ні да, ні не. Крыху лаяльнасці для прастакоў, крыху іроніі для дагадлівых, пару лацінскіх фраз, затым пераменна пакланіўся публіцы і сеў. Публіка зразумела, што гэты — не хвалюецца, не лічыць, ён чакае.

— Давайце гаварыць шчыра, — сказаў Маліняк і панізіў голас. — Я прафесар марксісцкай філасофіі, перакананы стопрацэнтны комуніст, беспартыйны, вядома. Адважваюся сцвярджаць, што ў Польшчы я выкладаў вучэнне Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. У Варшаўскім Вольным універсітэце пад відам курса філасофіі я чытаў курс марксісцкай дыялектыкі вышэйшай вады. Чэснае слова! Я не прашу, каб мне верылі на слова, інакш я мог-бы прасіць значна раней. Я напісаў сваю працу і цяпер магу прапанаваць яе вашай увазе. Тэма яе — марксісцкая філасофія, права і дзяржава. Асмельваюся быць упэўненым, што гэта праца ўнясе нешта новае ў марксісцкую навуку. А цяпер я буду шчыры да канца. Я хачу быць прынятым на службу ў Маскоўскі інстытут Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, думаю, што гэты рукапіс дае мне такое права...

Гутарка гэта адбывалася ў Беластоцкім абкоме партыі. Прафесара слухалі вельмі ўважліва, а потым спыталі — ці возьмецца ён напісаць работу: «Аб прычынах распаду польскай памешчыцка-капіталістычнай дзяржавы». Тэма вельмі і вельмі актуальная, а прафесару Маліняк тут і кнігі ў рукі.

Маліняк адказаўся. Адказаўся катэгарычна. Ён, бачыце, не можа ўзяцца за гэту тэму, бо яна недастаткова «распрацавана».

— І потым, давайце гаварыць шчыра, я паляк...

А якога-ж роду палякам належаць Маліняк? У былой Польшчы ён карыстаўся даволі шырокай вядомасцю. З кафедры ён любіў фарсіць рэволюцыйнай фразай. Потым перакінуўся ў лагер пілсудчыкаў. Больш усяго прафесар ганарыцца тым, што ў 1921 годзе яго прыцягнулі к удзелу ў складанні канстытуцыі Рэчы Паспалітай.

Такая фізіяномія гэтага, з дазволу сказаць, марксіста.

* * *

— Я паляк, — адчаканіў Ян Турлейскі і зрабіў паўзу. — Я паляк, але заўсёды ненавідзеў і ненавіджу былую польскую дзяржаву, заснаваную на эксплаатацыі, нацыянальным прыгнечанні, бяспраўі мас. Я аддаў усё, каб разбурыць гэту дзяржаву. За гэта мяне пазбавілі магчымасці вучыцца, пасадзілі ў турму, апранулі салдацкі шынель, паслалі на фронт, а я перайшоў на бок Чырвонай Арміі.

Беспартыйны тэхнік Ян Антонавіч Турлейскі стаяў на трыбуне выпраміўшыся і смела глядзеў у вочы сядзеўшым у зале людзям. Ён быў у ботах і блузе светлазялёнага колеру. Непаслухмяны светлы віхор валасоў уздрыгваў пры кожным павароце рукі. Ён гаварыў хутка і горача. Польская мова лілася не змаўкаючы, з кожнай новай фразай усё больш захапляючы зал. Трэба было бачыць, з якой увагай інтэлігенты Ломжы слухалі свайго кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей.

Ён гаварыў:

— Польская буржуазія імкнулася ператварыць інтэлігенцыю ў афіцэраў прамысловасці, у наглядчыкаў і паганятых над рабочымі і сялянамі. Совецкая ўлада прызвала нас служыць верай і праўдай народу і будаваць соцыялізм з рабочымі і сялянамі.

Хтосьці паглядзеў на Залеўскага. Мне ўспомніўся Маліняк. Турлейскі заклікаў ісці ўперад, а яны выжыдаюць.

Дастаткова было глянуць у зал на бліскучыя вочы, ўчашчана паднімаўшыеся грудзі, каб зразумець: матэматык пралічыўся, філосаф памыляецца.

г. Ломжа.

П. Лідаў.

(«Правда»).

ТЭЛЕГРАМЫ

ВЫСТУПЛЕННЕ ЧЭРЧЫЛЯ У ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

Лондан, 28 лютага. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што марскі міністр Чэрчыль выступіў учора ў палаце абшчын з прапановай аб асігнаванні сродкаў на марскі флот.

— Я,—заявіў Чэрчыль,—звяртаюся к палаце абшчын ад імені марскога флота з просьбай прадставіць нам крыху людзей, некалькі караблёў і крыху грошай". Заява Чэрчыля датычылася асігнаванняў для патрэб марскога флота сімвалічнай сумы ў 100 фунтаў стэрлінгаў, якая на самай справе прадстаўляе многа мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, і сапраўдныя размеры якіх не былі агалошаны.

Адзначыўшы, што Германія ў выніку розных прычын панесла вялікія страты ў падводным флоце, Чэрчыль разам з тым прызнаў, што Англія „панесла істотныя страты ад тых нямногіх германскіх падводных лодак, якія аперыруюць у цяперашні час". З наступленнем лета, — сказаў ён далей,— колькасць уступаючых у строй у Германіі падводных лодак будзе нарастаць, і Англія „павінна іх сустрэць новымі суднамі, пабудаванымі спецыяльна для барацьбы з падводнымі лодкамі".

Чэрчыль падверг рэзкай крытыцы пазіцыю нейтральных краін. Ён абвінавачваў іх у тым, што яны нібыта „прытрымліваюцца дактрыны, як бачна адобранай Германіяй". Гэта, па думцы Чэрчыля, пацвярджаецца тым нездавальненнем, якое выражана пазіцыяй нейтральных краін па поваду яго прамовы, у якой ён указаў гэтым краінам „на іх доўг".

Дакранаючыся гэтай пазіцыі нейтральных краін, Чэрчыль заявіў: „Не дзіўна, што англійскаму ўраду ўсё гэта надакучыла. Мне асабіста гэта таксама надакучыла". У гэтай сувязі Чэрчыль рэзка паставіў пытанне аб тым, што ў далейшым англійскі ўрад павінен адмовіцца ад „педантычнага тлумачэння" літары, правіл і канвенцыі, якія закранаюць нейтральныя краіны.

Гаворачы аб 6-месячных выніках марской вайны, Чэрчыль указаў, што агульны танаж страт англійскага ваеннага флота складае 63 тысячы тон, а „чыстыя страты" гандлёвага флота складаюць 200 тон. Чэрчыль прызнаў, што англійскі лінкор „Бархэм" пашкоджан тарпедай і што другі лінкор „Нельсон" наскачыў у снежні мінулага года на магнітную міну. Па словах Чэрчыля, абодва лінкоры ў хуткім часе ўступяць у строй.

(ТАСС).

Замежны друк аб поспехах Чырвонай Арміі на Карэльскім перашэйку

Нью-Йорк, 29 лютага. (ТАСС). Аналізуючы наступленне часцей Чырвонай Арміі на Карэльскім перашэйку, ваенны агляальнік газеты «Нью-Йорк пост» Праст піша, што Чырвоная Армія «сваім наступленнем на Карэльскім перашэйку ўжо амаль дасягнула намечанай мэты». Выкарыстанне геаграфічных умоў, піша Праст, сведчыць аб значным майстэрстве рускіх. Фіны знаходзяцца ў вельмі крытычным становішчы.

Амерыканскі журнал «Лайф» піша, што наступленне Чырвонай Арміі вымушае замежных карэспандэнтаў перагледзець іх погляды аб Чырвонай Арміі. Чырвоная Армія, заяўляе журнал, мае першакласную зброю, у асабліваці кулямёты і танкі. Маральнае становішча савецкіх войск добрае.

Лондан, 29 лютага. (ТАСС). Хельсінскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр заяўляе, што страта фінамі берагавых батарэй у Койвісто разглядаецца там, як сур'езны ўдар, таму што агонь гэтай батарэі не даваў магчымасці наблізіцца да берагу рускім баенным караблям і перашкаджаў спробам высадзіць дэсант за лініяй Манергейма.

Берлін, 29 лютага. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Нацыяналь-цэйтунг» паведамляе з Хельсінкі, аб вялікіх поспехах савецкіх войск у Фінляндыі. «Згодна атрыманым паведамленням, — піша карэспандэнт, — становішча фінаў на Карэльскім перашэйку становіцца з кожным днём усе больш крытычным. Асабліва паспяховым было наступленне Чырвонай Арміі у раёне Тайпале, дзе фінам былі нанесены адчувальныя ўдары. Мяцеліца, якая бушавала некалькі дзён у гэтым раёне, не змагла ні малейшым чынам зменшыць націск савецкіх войск. Становішча фінскіх войск на Карэльскім перашэйку настолькі безнадзейна, што аб гэтым пачынаюць гаварыць і ў афіцыяльных фінскіх зводках».

Сафія, 29 лютага. (ТАСС). Учарашнія газеты ў сваіх паведамленнях падкрэсліваюць, што заняцце савецкімі войскамі вострава Койвісто мае вялікае стратэгічнае значэнне. Газета «Зора» піша, што з падзеннем вострава Койвісто пачынаецца новая фаза наступлення на Карэльскім перашэйку. Непасрэдным рэзультатам падзення гэтых умацаванняў, піша газета, з'явіцца падзенне Выбарга».

«Увесь замежны друк, — піша газета «Утро», — ажыўлена абмяркоўвае заняцце вострава Койвісто савецкімі байцамі. Адзначаецца, што гэта падзея будзе мець рашаючае значэнне для далейшага ходу ваенных дзеянняў, бо крэпасць Койвісто з'яўляецца самай істотнай часткай абароннай лініі Манергейма.

Увесь балгарскі друк адзначае вялікую магутнасць Чырвонай Арміі, вядучай пераможнае наступленне ў Фінляндыі. Газета «Утро» адзначае, што савецкія войскі наступаюць з небывалай і нябачанай хуткасцю. Газета «Зора» падкрэслівае магутнасць і высокае тэхнічнае аснашчэнне Чырвонай Арміі. Падрабязна знаёміць чытачоў з тым, што сабой прадстаўляе лінія Манергейма, якая перамагаецца Чырвонай Арміяй. Пры гэтым газета асабліва падкрэслівае, што гэтыя ўмацаванні былі створаны «вопытнымі англійскімі, французскімі і германскімі ваеннымі спецыялістамі і ні ў якім разе не ўступаюць па крэпасці лініям Мажыно і Зігфрыда».

Антываенны рух ў англійскіх калоніях Вест-Індыі

Нью-Йорк, 29 лютага. Улады англійскіх калоній у Вест-Індыі (астравы ў Караібскім моры) прымаюць меры к падаўленню выступленняў насельніцтва супроць імперыялістычнай вайны. Выходзячая на востраве Ямайка газета «Іўнінг ньюс» нядаўна была забаронена таму, што яна смела і чэсна выкрывала імперыялістычны характар вайны, пачатай Англіяй і Францыяй у Еўропе. Выходзячая на востраве ліберальная газета «Барбадос обсэрвер» нядаўна выступіла супроць увядзення воінскай павіннасці, таму што англічане не прадстаўляюць насельніцтву Вест-Індыі элементарных дэмакратычных правоў. Гэта газета заяўляе, што рабочыя каланіяльных краін улічылі ўрокі мінулай імперыялістычнай вайны, калі імперыялісты далі абяцанні, якіх не выканалі, і указвае, што па заканчэнні мінулай сусветнай вайны становішча каланіяльнага насельніцтва яшчэ больш пагоршылася.

Нядаўна адбыўшаяся на востраве Трынідад канферэнцыя буйнейшых прафсаюзаў выказалася супроць падтрымкі Англіі ў вайне.

(ТАСС).

ВАЙНА Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Парыж, 28 лютага. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што «ў час паветраных аперацый адбыўшыхся за апошнія 48 гадзін над Францыяй былі збіты 2 германскіх самалёты».

Берлін, 28 лютага. (ТАСС). Па паведамленню інфармацыйнага бюро 2 германскіх самалёты, праводзіўшыя разведку англійскага і шатландскага пабярэжжа, даўшую вельмі каштоўныя звесткі, не звярнуліся на сваю базу. Экіпаж аднаго з іх быў падабран англійскім старажавым суднам. Адзін чалавек з састава гэтага экіпажа ранен.

Брюсель, 29 лютага. (ТАСС). У ваенным аглядзе французскай газеты «Журналь» за 28 лютага гаворыцца: «на фронце не адбылося нічога новага. Нямецкія патрулі прыбліжаліся к нашым перадавым пастам. Асаблівая актыўнасць немцаў наглядалася ў раёне Вогезаў. Усе іх спробы прасунуцца ўперад пацярпелі няўдачу. На моры таксама нічога асаблівага не адбылося. Па непацверджаным даным англійскімі ваеннымі караблямі патоплена 3-я нямецкая лодка. Актыўнасць авіяцыі значна ўзрасла. Адзін з нашых самалётаў быў атакован варожай супроцьпаветранай абаронай. Ухіляючыся ад выстралаў зенітнай артылерыі самалёт імкліва пікіраваў, што дало магчымасць германскаму камюніке заявіць: «Адзін французскі самалёт збіт». Тым не менш самалёт звярнуўся на сваю базу. Актыўнасць нямецкай авіяцыі была асабліва значная, Германскія самалёты лёталі над усходняй, паўночнай і паўночна-заходняй Францыяй. Самалёты два разы паяўляліся над Парыжам».

Парыж, 29 лютага. (ТАСС). У афіцыяльным павядамленні, надрукаваным у Парыжы ўчора вечарам гаворыцца, што «дзень прашоў спакойна».

У сёнешнім ранішнім павядамленні сказана: «Заходней Вогезаў — актыўнасць перадавых часцей. На Рэйне перастрэлка паміж умацаваннямі, размешчанымі ўздоўж берагоў».

Берлін, 29 лютага. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае: «На заходнім фронце адзначаецца ажыўлёная разведвацельная дзейнасць. Германскія разведвацельныя атрады паімкнуліся ўчора падыйсці ўшчыльную да лініі абароны праціўніка. Заходней Форбаха і паўночна-заходней Вейсенбурга германскія атрады захапілі многа палонных. Праціўнік страціў 4 чалавека забітымі і, адступіў, заставіў раненых на полі боя. Паўночна-заходней Вецінгена і ўсходней Мозеля разыграўся жорсткі бой, у якім прыняў удзел узмоцнены атрад германскіх разведчыкаў».



На здымку: Вучні — дзеці сялян вёскі Студзянка, Беластоцкага раёна звярачваюцца дадому са школы. (Фотахроніка БЕЛТА).

ПА ГОРАДУ І ОБЛАСЦІ

СОРТАВЫПРАБАВАЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ Ў БЕЛАСТОЦКАЙ ОБЛАСЦІ

Для правядзення работы па сортавыпрабаванню зернавых культур у Беластоцкай области будуць створаны 4 сортавыпрабавальныя ўчасткі: Ломжынскі — на тэрыторыі былой вопытнай станцыі ў Эльжбеціне, Бранскі — ў саўгасе «Каменны двор», Гродненскі — ў саўгасе Станіславова і Свіслацкі.

Ломжынскі сортавыпрабавальны ўчастак пачне работу вясной, а астатнія ўчасткі восенню.

—о—

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ

У бліжэйшыя дні будуць арганізаваны трохмесячныя курсы для падрыхтоўкі будаўнічых рабочых: каменшчыкаў, тынкоўшчыкаў і іншых спецыялістаў па будаўніцтву.

Курсы разлічаны на 70 — 80 чалавек.

—о—

КРАДЗЕЖ З УЗЛОМАМ

Беластоцкі народны суд 5 участка ў саставе народнага суддзі тав. Багдаоўскага і народных засядацеляў Іваноўскай і Маліноўскага, пры ўдзеле пракурора тав. Лукоўнікова і абаронца тав. Аркіна, разгледзеў справу Врублеўскага А. Л., Курнатовіча Э. К. і Лышчыка В. Г., абвінавачваемых па арт. 240б крымінальнага кодэкса БССР.

Судовым следствам устаноўлена, што 8 студзеня 1940 г. Врублеўскі і Курнатовіч зрабілі крадзеж рэчаў шляхам узлому замка ў гр. Стольскага, пражываючага ў Беластоку. Падсудныя ўкралі некалькі пальто, світраў і г. д. на суму каля 8.000 руб.

Украдзеную вопратку Врублеўскі і Курнатовіч занеслі для продажу да падсуднага Лышчыка, які купіў частку рэчаў за 1500 руб.

Суд, выслухаўшы паказанні падсудных і сведак, прызнаў Врублеўскага і Курнатовіча вінаўнікамі і прыгаварыў іх да пазбаўлення волі: Врублеўскага тэрмінам на 2 гады а Курнатовіча на $1\frac{1}{2}$ г.

Абвінавачаны Лышчык, паколькі судовым следствам не даказана, што ён ведаў паходжанне купленых ім рэчаў, апраўдан судом.

—о—

ХРОНІКА

Аблвыканком зацвердзіў тав. Гажноўскага намеснікам старшыні аблвыканкома па пытаннях прамысловасці і гандлю, а тав. Грыбаеда — намеснікам старшыні па пытаннях сельскай гаспадаркі і загатовак.

ХРОНИКА

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР назначыў тав. Пацёмкіна В. П. Народным Камісарам Асветы РСФСР.

* * *

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР вызваліў тав. Тюркіна П. А., згодна яго просьбы, ад абавязкаў Наркома Асветы РСФСР.

Соўнарком Саюза ССР вызваліў тав. Пацёмкіна В. П. ад абавязкаў Намесніка Наркома Замежных Спраў Саюза ССР ў сувязі з пераходам на другую работу.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

ОБЯЗАТЕЛЬНОЕ ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 149

Областного Исполнительного Комитета

29 февраля 1940 г. г. Белосток.

О РЕГИСТРАЦИИ ИНОСТРАНЦЕВ, ПРОЖИВАЮЩИХ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОСТОКСКОЙ ОБЛАСТИ.

С целью обмена документов и получения разрешения на право дальнейшего проживания в СССР иностранцам и лицам, считавшимся в бывшем польском государстве без подданства и проживающих в настоящее время на территории Белостокской области, Белостокский Облисполком ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1) Обязать всех иностранцев и лиц, проживающих на территории Белостокской области, считавшихся без подданства в бывш. польском государстве, явиться для регистрации с 4. марта по 13. марта 1940 г. в паспортные столы районных отделений РК Милиции УНКВД по Белостокской области по месту жительства, со своими иностранными паспортами и документами на право проживания в бывш. польском государстве, выданными б. польским правительством иностранцам.

Проживающие в г. Белостоке проходят регистрацию в Управлении РК Милиции УНКВД по Белостокской области по ул. Красноармейской, дом № 65.

2) Иностранцы, не явившиеся на регистрацию в указанный срок без уважательных причин, будут привлечены к административной ответственности, штрафу в размере до 100 рублей.

3) Возложить надзор за выполнением обязательного постановления на РК Милиции.

4) Настоящее обязательное постановление входит в силу со дня опубликования его в печати.

Председатель Облисполкома МАЛЬЦЕВ

Секретарь ЕГОРОВ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партыйнага і савецкага аддзелаў—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62; выдавецтва і аддзела аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 245.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.